Эмануіл
ІОФЕ

# Колькі ж яўрэяў загінула на беларускай зямлі ў 1941–1945 гг.

Многія дзесяцігоддзі людскія страты Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны вызначаліся лічбай, якая ўвайшла ва ўсе энцыклапедыі і даведнікі — 2 200 тыс. чалавек. Яна ўзята з справаздачы ЦК КП(б)Б Цэнтральнаму Камітэту УКП(б) аб людскіх і матэрыяльных стратах, панесеных Беларускай ССР у выніку нямецка-фашысцкай акупацыі, складзенай па актах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДК) не раней 1 снежня 1946 г., дзе адзначалася: "...Нямецкімі захопнікамі забіта і замучана больш 2 200 тыс. чалавек"[1].

Між тым даследаванні вучоных нашай рэспублікі, праведзеныя ў канцы 80-х—90-я гг., даюць магчымасць удакладніць гэтую лічбу. Так, А.Літвін і Я.Паўлаў заўважаюць: "У гэтую агульную лічбу не ўключаны тыя, хто быў вывезены ў Германію і загінуў там. Па розных прычынах звыш 260 тыс. жыхароў Беларусі не вярнулася на Радзіму.

У гэту статыстыку не ўключаны жыхары Беларусі, якія змагаліся ў Чырвонай Арміі, прапалі без вестак ці загінулі ў палоне, а таксама загінуўшыя ў партызанскіх атрадах.

Больш таго, цяпер высветлілася, што дадзеныя Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па шэрагу раёнаў значна заніжаны...

Да гэтага трэба дадаць, што дадзеныя НДК не зусім дакладныя і па шэрагу лагераў ваеннапалонных. Так, у лагеры ваеннапалонных у Масюкоўшчыне было зафіксавана звыш 80 тыс. загінуўшых. Дзякуючы беларускім даследчыкам тут знойдзены яшчэ шэраг брацкіх магіл, у выніку лічба ахвяр павялічылася да 110 тыс. Ужо пасля роспуску камісіі дадаткова былі знойдзены пахаванні 150 тыс. чалавек, якія раней не былі вядомыя. Такім чынам, колькасць загінуўшага насельніцтва Беларусі была значна большая"[2].

14 лістапада 1995 г. "Народная газета" надрукавала артыкул вучонага сакратара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, намесніка старшыні гісторыка-мемарыяльнага фонду "Трасцянец" А.Ванькевіч "Ахвяраў было значна больш". Аўтар на падставе архіўных дадзеных прыходзіць да высновы, што на самай справе колькасць ахвяр лагера смерці Малы Трасцянец у гады Вялікай Айчыннай вайны склала 546 тыс. чалавек, а не 206,5 тыс., як лічыцца афіцыйна па сённяшні дзень. Розніца складае 339,5 тыс. чалавек. Ёсць падставы меркаваць, што большасць гэтых ахвяр — яўрэі Беларусі і краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Вучоным нашай рэспублікі добра вядома імя таленавітага даследчыка-дэмографа С.Польскага. Яшчэ ў 1990 г. ён прыйшоў да вывадаў, што "дэмаграфічныя страты рэспублікі склалі каля 3 млн. чалавек... Такім чынам, калі падвесці вынік, — адзначаў С.Польскі, — то агульныя дэмаграфічныя страты насельніцтва Беларусі ў гады вайны складуць велічыню, блізкую да 4 млн. чалавек! Гэта азначае, што ў рэспубліцы загінуў не кожны чацвёрты, як мы прывыклі лічыць доўгія гады, а амаль кожны другі!"[3]

Колькі ж яўрэяў загінула на беларускай зямлі ў час Вялікай Айчыннай вайны? У літаратуры прыводзіліся лічбы: 300 тыс., 350 тыс., 400 тыс., 500 тыс. Так, Р.Чарнаглазава адзначае, што ў выніку злачынных дзеянняў акупантаў на беларускай зямлі было знішчана 400 тыс. яўрэяў[4], а на думку А.Багровіча, у 1941—1944 гг. загінула паўмільёна яўрэяў[5].

Зусім іншыя лічбы даюць замежныя даследчыкі Халакоста (Катастрофы). Р.Хільберг, напрыклад, лічыць, што падчас Халакоста ў Беларусі загінуў 1 млн. яўрэяў[6], Дж.Робінсан — 700 тыс.[7], М.Гілберт — 245 тыс.[8], а Энцыклапедыя Халакоста называе лічбу ў 1 млн. чалавек[9].

Для таго, каб правільна вызначыць колькасць ахвяр, паспрабуем вызначыць, колькі яўрэяў жыло ў Беларусі напярэдадні вайны і колькі іх засталося пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Насельніцтва БССР да пачатку Вялікай Айчыннай вайны складала 10 млн. 528 тыс. чалавек, а ў сучасных граніцах — 9 200 тыс. чалавек[10].

Згодна перапісу, праведзенаму ў студзені 1939 г., у БССР пражывала больш як 375 тыс. яўрэяў[11]. Улічваючы сярэднегадавы прырост яўрэйскага насельніцтва ў 1939—першай палове 1941 гг., ёсць усе падставы меркаваць, што да пачатку вайны на яе тэрыторыі жыло каля 405 тыс. яўрэяў.

Колькі ж яўрэяў жыло ў Заходняй Беларусі?

Усяго ў 1941 г. насельніцтва Заходняй Беларусі складала прыблізна 5 млн. чалавек, з якіх беларусы складалі 77%, яўрэі — 12,8%, рускія — 5,1%, літоўцы — 1,5%, палякі — 1,3%, украінцы — 1,3%, іншыя —1%[12].

Для даследчыка Халакоста беларускага яўрэйства важна ўлічыць вялікую колькасць бежанцаў з Заходняй і Цэнтральнай Польшчы, якія з'явіліся на беларускіх землях пасля пачатку другой сусветнай вайны ў верасні—кастрычніку 1939 г. Значная большасць гэтых бежанцаў асела ў заходніх абласцях Беларусі.

З моманту нападу фашысцкай Германіі на Польшчу на тэрыторыі Беларусі, паводле дадзеных даследчыка А.Хацкевіча, пражывала каля 100 тыс. бежанцаў, галоўным чынам з спрадвечных польскіх тэрыторый. 90% гэтых бежанцаў, ці 90 тыс. чалавек, складалі яўрэі[13]. Іншыя даследчыкі называюць лічбу ў 200 тыс. бежанцаў.

Такім чынам, на тэрыторыі Заходняй Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны пражывала 640 тыс. яўрэяў, у тым ліку каля 45 тыс. яўрэяў у Беластоку і каля 90 тыс. у раёнах Беластоцкай вобласці, якія адышлі ў 1944 г. да Польшчы.

Паводле дадзеных аўтара гэтых радкоў, каля 5 тыс. яўрэяў-бежанцаў з Польшчы ў 1940—1941 гг. былі дэпартаваны ў аддаленыя раёны СССР.

Колькі ж яўрэяў жыло ў Беларусі ў чэрвені 1941 г.?

На думку польскага даследчыка Ю.Туронка, іх было 700—750 тыс.[14].

Аднак паводле нашых падлікаў, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларускай ССР пражывала 1 130 тыс. яўрэяў, а ў сучасных межах Рэспублікі Беларусь — 995 тыс. яўрэяў.

З першых дзён вайны пачалася эвакуацыя мірнага насельніцтва на ўсход. Да моманту акупацыі нямецка-фашысцкімі войскамі з БССР паспела эвакуіравацца каля 1,5 млн. чалавек. З вялікай ступенню верагоднасці можна сцвярджаць, што не менш як 10% гэтай колькасці складалі яўрэі.

Колькі ж беларускіх яўрэяў было мабілізавана і добраахвотна ўступіла ў рады Чырвонай Арміі? Сёння мы можам адказаць на гэта пытанне: іх было 110 тыс. чалавек[15].

Якія страты панеслі яўрэі Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны? Дакладна адказаць на гэта пытанне вельмі цяжка. Мы можам адказаць толькі прыблізна. Вядома толькі, што з 500 тыс. яўрэяў-франтавікоў Чырвонай Арміі загінула 216 тыс.[16]

Калі палічыць страты прапарцыянальна колькасці ўдзельнікаў вайны — ураджэнцаў Беларусі, то атрымаецца, што на франтах Вялікай Айчыннай вайны загінула каля 48 тыс. беларускіх яўрэяў.

Значыцца, на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай гітлераўцамі, засталося каля 870 тыс. яўрэяў.

З гэтай колькасці засталося ў жывых прыкладна 20 тыс. чалавек. Гэта галоўным чынам тыя, хто ўцёк з гета ў партызанскія атрады, хто жыў па чужых дакументах, тыя яўрэйскія дзеці, што знаходзіліся ў дзіцячых дамах як дзеці беларусаў, палякаў, рускіх, украінцаў, тыя, каго выратавала мясцовае насельніцтва, хто вёў падпольную работу ў тыле ворага.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што ў 1941—1945 гг. загінула 898 тыс. яўрэяў (870 тыс. — 20 тыс. + 48 тыс. яўрэяў, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай). У сучасных межах Беларусі гэта лічба загінуўшых яўрэяў складае 763 тыс. чалавек.

А цяпер пра загінуўшых яўрэяў замежных краін. Тут, на беларускай зямлі, знайшлі сваю смерць дзесяткі тысяч яўрэяў з 7 краін Еўропы — Аўстрыі, Галандыі, Германіі, Венгрыі, Польшчы, Францыі і Чэхаславакіі.

З лістапада 1941 г. па кастрычнік 1942 г. у Мінск было дэпартавана больш за 35 тыс. яўрэяў з Трэцяга рэйха[17].

У звароце мінчан да І.Сталіна ў жніўні 1944 г. гаварылася пра 40 тыс. замежных яўрэяў, загінуўшых у Мінскім гета і ў наваколлі Мінска[18].

З вясны да пачатку восені 1943 г. у "Лясным лагеры", які знаходзіўся паблізу Бабруйска, было расстраляна каля 4 тыс. яўрэяў мужчын-вязняў Варшаўскага гета[19].

У сваёй кнізе "...И ужаснулась земля" даследчык Халакоста з Баранавіч Б.Шэрман адзначае, што ў час вайны ў г. Баранавічы было знішчана прыкладна 2 тыс.яўрэяў з Германіі, 500 чалавек з Польшчы і 300 — з Аўстрыі[20].

28 чэрвеня 1942 г. з Цярэзіна праз Ваўкавыск у Баранавічы прыбыў эшалон. У ім знаходзілася 997 яўрэяў з розных гарадоў Чэхаславакіі. Яны былі расстраляны ва ўрочышчы Гай, за два кіламетры ад ст. Баранавічы.

Паводле сведчанняў відавочцаў, знішчэнне яўрэяў з Польшчы і Германіі пра-

водзілася ў Магілёве, у лагеры, размешчаным на тэрыторыі завода імя Г.Дзімітрава[21].

Смяротнасць сярод яўрэяў з еўрапейскіх краін была вышэйшая, таму што яны былі менш прыстасаваны да цяжкіх умоў жыцця. Без ведання мовы, без сувязей ім было цяжка прадаваць або выменьваць рэчы на прадукты ў мясцовага насельніцтва. І калі з ліку беларускіх яўрэяў выратаваліся тысячы, то з яўрэяў шэрага еўрапейскіх краін, прывезеных нацыстамі ў нашу рэспубліку, на вялікі жаль, выратаваліся толькі дзесяткі.

Таму ёсць падставы меркаваць, што ў 1941—1944 гг. на беларускай зямлі было знішчана каля 48 тыс. яўрэяў з сямі еўрапейскіх краін.

Калі падсумаваць усё, што сказана вышэй, то трэба сказаць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі загінула 946 тыс. яўрэяў (898 тыс.+48 тыс.). У сучасных межах нашай рэспублікі гэта лічба складае 811 тыс. чалавек (763 тыс.+48 тыс.).

Праблема ахвяр Халакоста на беларускай зямлі патрабуе далейшага ўдакладнення і далейшага даследавання. Апошнюю кропку ў гэтай справе ставіць яшчэ рана.

---

[1] НА РБ, ф. 4, воп. 29, спр. 521, аа. 2—3. Завераная копія.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х частках. Ч. 2. Мн., 1995, с. 323.

[3] Польскі С., Мацюнін С. Цана перамогі // Літаратура і мастацтва, 1990, 6 ліпеня.

[4] Трагедия евреев Белоруссии в 1941—1944 гг.: Сб. материалов и документов. 2-е испр. и доп. изд. Мн., 1997, с. 28.

[5] Багровіч А. Жыхарства Беларускай ССР у святле перапісу 1959 году. Нью-Ёрк—Мюнхэн, 1962, с. 65.

[6] Hilberg R. The Destruction ot European Jews. New York, 1961, p. 767.

[7] Robinson J. Holocaust. Egcyclopedia Judaica. Jerusalem, 1971, voi. 7, p. 889.

[8] Gilbert M. Atlas of the Holocaust. London, 1982, p. 244.

[9] Энциклопедия Катастрофы / Под. ред. И.Гутмана. Тель-Авив, 1990.

[10] Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Мн., 1978, с. 49.

[11] Всесоюзная перепись населения 1939 года: Основные итоги. М., 1992, с. 70.

[12] Volacic Micola. The Population of Western Beiorussia and its Resettlement in Poiand and the USSR // Belorussian Review. № 3. Munich: Institute tor the Study ot the USSR, 1956, pp. 15,16.

[13] Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс, 1994, № 2, сс. 73—76.

[14] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993, с. 62.

[15] Очерки еврейского героизма. Т. 3. Киев, 1997, с. 466.

[16] Там жа, с. 462.

[17] Арад И. Холокаст. Катастрофа европейского еврейства. Иерусалим, 1990, с. 80.

[18] Шварц С. Евреи в Советском Союзе с начала второй мировой войны (1939—1965). Нью-Йорк, 1966, с. 147.

[19] Арад И. Холокаст, с. 80.

[20] Шерман Б.П. ...И ужаснулась земля. Барановичи, 1990, с. 45.

[21] Трагедия евреев Белоруссии в 1941—1944 гг. Мн., 1997, с. 25.